Уладзімір БРОВІКАЎ:

„У дэмакратыі два антыподы — таталітарызм і анархія...“

Пасля лютаўскага і сакавіцкага Пленумаў ЦК КПСС, на якіх абмяркоўваліся праекты Платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда партыі і Статута КПСС, на палітычным гарызонце зноў з'явіўся Уладзімір Бровікаў. Былы прэм'ер-міністр Беларусі, у пачатку 1986 года нечакана стаўшы Паслом Савецкага Саюза ў Польшчы. Яго выступленні на двух партыйных Пленумах, якія ўтрымлівалі вострую крытыку сённяшняга становішча ў Кампартыі і пазіцыі яе лідэраў, адных непрыемна ўразілі, а другіх парадавалі.

«Стваравецца ўражанне,—гаварыў у лютым аб Платформе ЦК У. Бровікаў,—што дакумент носіць утылітарны характар і закліканы задавальняць неадкладныя патрэбы нашай палітыкі... У абмяркоўваемым дакуменце дастаткова дыфірамбаў у адрас перабудовы, крытыкі далёкага мінулага і шчодрых абяцанняў на будучае, але затое практычна адсутнічае ацэнка цяперашняга, дапушчаных не некалі, а за перабудовачны перыяд памылак...»

«Лічу,—сказаў ён ужо ў сакавіку,—што за крызіс у краіне і партыі абавязаны асабіста адказваць не толькі таварыш Лігачоў, якога тут называлі, але і таварышы Гарбачоў, Мядзведзеў, Слюнькоў, Якаўлеў, Лук'янаў. Яны, мне здаецца, не зусім апраўдалі аказаны ім давер і не поўнасцю справіліся з даручанымі ўчасткамі работы...»

Сёння мы публікуем гутарку нашых спецыяльных карэспандэнтаў з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом СССР у Рэспубліцы Польшчы, членам ЦК КПСС Уладзімірам БРОВІКАВЫМ, якая адбылася ў рэзідэнцыі пасла ў Варшаве.



— Уладзімір Ігнатавіч, вашы апошнія выступленні на Пленумах ЦК КПСС атрымалі супярэчлівую, неадназначную ацэнку ў грамадстве. І да гэтага часу можна сустрэць у прэсе розныя выказванні з гэтага выпадку...

— Тая неадназначнасць упаўне зразумелая. Таму што ўсё, што адбываецца ў нашай краіне і ў краінах нашых саюзнікаў, ацэньваецца неадназначна. І па ацэнцы гэтых працэсаў можна меркаваць аб людзях, аб іх пазіцыях. Напрыклад, як я ацэньваю тое, што адбываецца ў Польшчы. Тут у сілу розных аб'ектыўных прычын сацыялізм як грамадска-эканамічная фармацыя быў узяты пад сумненне, а потым паступова дыскрэдытаваны. Як сістэма, якая не прынесла народу па сутнасці элементарнага. Я думаю, што аб'ектыўна так і складвалася. Сацыялізм за гэтыя гады панёс буйныя страты...

Што ж датычыць маіх выступленняў на Пленумах, то пасля іх я атрымаў сотні пісьмаў і тэлеграм з усіх куткоў краіны, аўтары якіх падтрымліваюць маю пазіцыю. Дарэчы, сярод гэтай масы водгукаў было толькі два пісьмы з непрыняццем такіх поглядаў, ды і то—ананімныя...

— У першым сваім выступленні вы зрабілі прамы намёк (але без указання канкрэтных палітычных дзеячаў) на тых, хто павінен панесці адказнасць за крызіснае становішча, у якое трапіла і краіна, і партыя ў ходзе перабудовы. У другім выступленні вы ўжо назвалі канкрэтныя прозвішчы... Калі ўявіць, што гэтыя людзі ў сілу розных абставін пойдуць з палітычнай арэны да або ў час XXVIII з'езда, ці зменіцца што-небудзь ад гэтага?

— У канчатковым выніку тое, што адбываецца ў нашым жыцці, залежыць не столькі ад саміх асоб, якія знаходзяцца ў кіраўніцтве партыі і краіны, колькі ад той палітыкі, якая праводзіцца імі. І я думаю, што нічога не зменіцца, калі не зменіцца сама палітыка. Калі мы будзем мяняць асобы ў верхнім эшалоне ўлады, а палітыка наша не будзе больш узважанай, больш навукова абгрунтаванай, не будзе ясна ўяўляць сабе сацыяльна-палітычныя вынікі прымаемых мер, то мала будзе толку. Пакуль у мяне склалася такое ўражанне, аб гэтым я гаварыў на гэтых двух Пленумах, што многія нашы рашэнні па кардынальных пытаннях прымаліся наспех, без дастатковай навуковай прапрацоўкі, без дакладнага ўяўлення таго, што з гэтага атрымаецца.

— Уласна кажучы, як здарылася і з апошнімі законамі...

— Як і з законамі, аб якіх я таксама гаварыў. Я добра ўяўляю тое, чаму гэта так адбываецца. Думаю, ад жадання хутчэй нешта зрабіць, хутчэй вырашыць праблемы. І тут у супярэчнасць уваходзяць жаданні і тая паспешлівасць, з якой прымаем рашэнні. Прычым, калі яны прымаюцца, мы раскручваем махавік прапаганды, даказваем, як гэта добра і якія вялікія вынікі нам гэта абяцае. А потым аказваецца, што ўсё гэта зусім не так, і мы ўжо пачынаем шукаць прычыны, чаму так здарылася. А прычыны, як правіла, не шукаем у саміх сябе. І гаворым: мы не думалі, што будзе так складана.

Але калі не думалі, то не трэба займацца палітыкай! Таму што палітыка—гэта перш за ўсё прадбачанне. Калі прымаецца закон, а затым дрэнна працуе і замест дабра прыносіць зло, то гэтым расхістваецца грамадскі давер. Цяпер мы шмат увагі ўдзяляем заканатворчасці, і, напэўна, гэта правільна. Але вельмі мала ўвагі—арганізацыі выканання законаў нем. Таму законы прыняты, але многія не працуюць. У нас ёсць старыя добрыя законы, але яны таксама не працуюць...

Сапраўды, перабудова разбудзіла думку, натхніла людзей да творчасці. Думаю, што тыя многія вучоныя, якія працуюць цяпер у Вярхоўным Савеце краіны і якія набліжаны да нашых інстытутаў улады, напэўна, верылі ў сапраўднасць сваіх канцэпцый, сваіх прапаноў. Але няма моцнага ядра тэарэтычна падрыхтаваных людзей, якія маглі б аддзяліць зерне ад пустазелля і ўзяць самае рацыянальнае. Таму, што калі цяпер кідаць за кожнай парадай кожнага эканаміста, то наогул можна зламаць сабе шыю...

— Бо кожны адстойвае сваю канцэпцыю, а іншыя адмятае...

— Так. А аўтары канцэпцый таксама ж выйшлі з мінулага, выраслі з мінулых уяўленняў, з эканамічнай тэорыі сацыялізму. І ў многім — дагматыкі, хоць цяпер выдаюць сябе за ультрарэвалюцыянераў.

Прыватная ўласнасць? А што, няхай прыватная ўласнасць. Эксплуатацыя? Можа, і эксплуатацыя. Беспрацоўе, рынак працы? Павінен быць рынак працы: будзе стымул працаваць, трымацца за рабочае месца, расці, павышаць кваліфікацыю... Усё гэта, напэўна, так. І так можа быць. Але так хутка кідацца на ўсе гэтыя рэчы ў маштабе краіны вельмі небяспечна.

Мы пачалі вялікую справу, пачалі перабудову. Сапраўды, так, як мы жылі, жыць нельга. Таму што ў нас накапілася столькі ўсяго, што мы адносім да грубага ўраўніцельнага або казарменнага, і нават ваеннага камунізму, — усё гэта цяпер нікуды не варта. Ад гэтага трэба пазбаўляцца. Патрэбна сапраўды дэмакратыя, бы. Таму што асоба, якая валодае свабодай (у тым разуменні свабоды як усвядомленай неабходнасці) можа развівацца і рухаць тую справу, якой яна служыць. Гэта ўсё так.

Але, разумееце, мы пачалі гэту справу вельмі хаатычна. І я, напрыклад, не думаю, што для таго, каб стала лепш, абавязкова спачатку павінна быць горш. Добра, мы закляймілі застойны перыяд... Але як ён характарызаваўся, напрыклад, гэты застойны перыяд? Вось на XXVII з'ездзе ў Палітычным дакладзе гаворыцца: «З часу прыняцця цяпер дзеючай Праграмы партыі савецкае грамадства далёка прасунулася ў сваім развіцці. Мы адбудавалі па сутнасці занава сваю краіну, дабіліся вялікіх зрухаў у эканоміцы, культуры, сацыяльнай галіне, выхавалі пакаленні стваральнікаў новага грамадства... Значна падужэлі пазіцыі нашай Радзімы, сусветнага сацыялізму на міжнароднай арэне..» Як нібыта не ўчора гаварылася, а бог ведае калі!

Яшчэ цытата (ужо прабачце): «Пройдзены краінай шлях, яе эканамічныя, сацыяльныя і культурныя дасягненні — перакананчае сведчанне жыццёвасці марксісцка-ленінскага вучэння, вялікага патэнцыялу, закладзенага ў сацыялізме, увасобленага ў прагрэсе савецкага грамадства...» Гэта ўжо нібыта цяпер і не наша тэрміналогія... «Цэнтральны Камітэт паслядоўна кіруецца марксізмам-ленінізмам—сапраўды навуковай тэорыяй грамадскага развіцця... Яе жыццёвая сіла — у сталай маладосці... Выкарыстаць перавагі і магчымасці сацыялістычнага ладу...»

Такая вось дэфармацыя. Фразеалогія яшчэ застаецца сацыялістычнай, мы яшчэ нібыта пад флагам марксізму-ленінізму знаходзімся. Хоць, праўда, ужо адыходзім. У праекце нашай Платформы ўжо саромеемся слоў «марксізм-ленінізм», «камунізм» і спрабуем іх не ўжываць, баючыся крытыкі справа. Па сутнасці вядзём лінію на іншае — на рэстаўрацыю капіталізму. Але тады трэба так дакладна і сказаць: сацыялізм, маўляў, сябе зганьбіў, і не трэба ніякай яму чалавечай асобы. Калі ён такі, які ёсць, то—адмовіцца ад яго. І пайсці або трэцім шляхам, або вярнуцца на капіталістычны шлях. І тады не будзе двудушнасці нашай.

— А так суцэльная паўпраўда і паўмеры...

— Зусім так. Мы ж хлусім сабе! Мы гаворым аб гуманным, дэмакратычным сацыялізме. А сацыялізм жа — гэта і ёсць у нашым разуменні ўвасабленне ўсіх гэтых рыс, увасабленне гуманнага, сапраўды дэмакратычсацыялізму ў практыцы, можа быць, і ў тэорыі, няправільна, напэўна, уяўлялі сабе палітычную эканомію сацыялізму, былі вельмі дагматычнымі, пайшлі за Сталіным у гэтых уяўленнях. І тэорыя наша была на службе ў палітыкаў — у Сталіна, у Хрушчова і гэтак далей. Мы тэорыю заўсёды падтасоўвалі пад канкрэтную асобу. І сацыялізм як тэорыя і як палітыка, і як практыка, вядома, вось за гэтыя 72 гады нашых і 40—45 гадоў у нашых сяброў быў дэфармаваны. І тут няма ніякіх пытанняў. Можа, і роля партыі была дэфармавана.

Але цяпер, калі мы з вышыні сённяшняга дня гаворым аб гэтым, то, натуральна, мы ўжо разумныя. А мы ж усе там працавалі, былі ж зусім канкрэтныя гістарычныя ўмовы. І зусім канкрэтныя гістарычныя задачы вырашаліся — і партыяй, і народам...

Я вельмі добра памятаю сваё дзяцінства і юнацтва. Калі прыйшлі фашысты, я быў ужо хлапчуком, які ўсё ўсведамляў. І мяне захліставалі патрыятычныя пачуцці. Мы збіраліся разам — па 8—9 гадоў хлопцам — і гаварылі: «Не, нашых не перамогуць! Чырвоныя ўсё роўна прыйдуць!» Быў нейкі гонар за сябе, за Радзіму, за рэвалюцыю! І вось тое, што мы гэта страцілі, я не магу зразумець. У ЗША ж ужо 41 прэзідэнт. І няма, заўважым, ніводнага дрэннага. А ў нас няма ніводнага добрага... Апрача Леніна.

— І на Леніна ўжо пайшла атака...

— Ну, гэта стратэгічна. Ужо падрыхтавана адпаведная глеба і пад Леніна. І мы ж нават не абараняемся! Нават лічыцца прызнакам дагматызму абараняць Леніна. А апрача ж усяго іншага гэта — стваральнік нашай дзяржавы. Драматычна складвалася гісторыя краіны, але гэта — наша гісторыя! І гісторыю нельга мяняць, як нельга памяняць маці. Гэта рэчы, якія ніяк нельга адкінуць.

...Я меркаваў, што мяне адразу ж аднясуць да дагматыкаў. Але, думаю, што лепш заставацца на сваіх прынцыповых пазіцыях, пакуль ад іх не адышоў свядома, чым так ужо хутка «перабудоўвацца» і кідацца да пазіцый, якія цяпер здаюцца моцнымі. Хоць у пазіцыі многіх левых, лічу, больш правага ухілу, чым левага...

Гутарку вялі Алег НІКАЛАЙЧЫК і Сяргей ТРУСЕВІЧ, карэспандэнты «Працы» — спецыяльна для «Звязды».

Фота з газеты «Палітыка». Варшава — Мінск.

(Заканчэнне будзе).

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы